Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

Орган парткама і прафкама Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта

№ 7 16 кастрычніка 1935 г. № 7

Дастойна сустрэць XVIII гадавіну Окцябрскай рэволюцыі

XVIII гадавіну Окцябрскай рэволюцыі працоўныя Совецкага Саюза сустракаюць пераможным будаўніцтвам соцыялізма.

„Перамога соцыялізма ў СССР—перамога сусветнага значэння атрыманая пры падтрыманні сусветнага пролетарыята, рабочымі і калгаснікамі СССР, пад кіраўніцтвам лепшага саратніка вялікага, ЛЕНІНА, мудрага правадыра працоўных усяго свету тав. СТАЛІНА ..“ (з пастановы VII канграса Комінтэрна).

Гэтую перамогу працоўныя СССР замацоўваюць разгортваннем масавага руху лепшых людзей барацьбы за соцыялізм: стаханаўцаў, бусыгінцаў і крываносаўцаў.

Стаханаўскі рух ахапіў усе галіны нашай вытворчасці ва ўсіх краях і абласцях нашай соцыялістычнай радзімы. Па ініцыятыве рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода імя тав. Молатава прадпрыемствы Совецкай Беларусі, сустракаючы XVIII гадавіну Окцябрскай рэволюцыі, ўключыліся ў барацьбу за датэрміновае і добраякаснае выкананне промфінплана.

Хваля новых соцыялістычных метадаў—метадаў ператварэння руху адзіночак—„выдатнікаў“ ў масавы рух барацьбы за высокаякасную вучобу-асноўны наш лозунг падрыхтоўкі да XVIII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі.

Поспехі, якіх дабіўся БДУ ў III-м туры соцыялістычнага спаборніцтва ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў нас задаволіць не могуць.

Гэты навучальны год павінен быць пераможным ў сэнсе ўзняцця якасці вучобы і навукова-даследчай работы. „Вырашчываць стаханаўцаў“—наш лозунг Гэта справа усяго студэнцтва і навуковых работнікаў.

Окцябрская рэволюцыя гэтую магчымасць нам прадставіла. Мы сыны рабочых і калгаснага сялянства, прышоўшы на вучобу з надыходам вялікага Окцябра, павінны ўсе свае сілы і маладую энергію аддаць на ўсебаковае і глыбокае вывучэнне нашай спецыяльнасці, не дапускаць браку ў вучобе, уключыцца ў навукова-даследчую работу для набыцця практычных навыкаў па спецыяльнасці, бо **„нам патрэбны такія камандныя і інжынерна-тэхічныя сілы, якія здольны зразумець палітыку рабочага класа нашай краіны, здольны ўсвоіць гэту палітыку і гатовы ажыццявіць яе сумленна“** (І. СТАЛІН).

Павышэнне агульна-культурнага, ідэйна-палітычнага ўзроўня студэнцтва, рашучае паляпшэнне масава-палітычнай работы і марксісцка-ленінскага выхавання студэнцтва ва ўніверсітэце—галоўнейшыя задачы падрыхтоўкі самага каштоўнага ў гаспадарцы—кадраў.

Вялікую гадавіну Окцябра неабходна правесці ярка, красачна, з багатым палітычным зместам.

Разгарнуць палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнцтва і навуковых работнікаў. Павысіць класавую пільнасць. Распрацаваць у кожнай вучэбнай групе, на кожным курсе палітгуртку і ў інтэрнатах аб ролі Леніна-Сталіна ў справе вялікіх заваёў Окцябра, у справе буйных перамог будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне.

Цяпер трэба ўжо заняцца падрыхтоўкай да дэманстрацыі. Навучыць студэнтаў добра хадзіць у ногу, асабліва першага курса, падрыхтаваць лозунгі плакаты, аформіць Окцябрскую калону прыгожа. Падрыхтаваць выступленне зацейнікаў на музычных інструментах (гармошка, мандаліна, балалайка).

XVIII Окцябр СССР сустракае ў той час, калі сусветны эканамічны крызіс і зрыў капіталістычнай стабілізацыі парадзілі крайнюю неўстойлівасць усіх сусветных адносін. Абвостраная барацьба на сусветным рынку, надта звузіўшымся ў выніку эканамічнага крызіса, перайшла ў ажэстачонную эканамічную вайну. Новы перадзел свету фактычна пачаўся ўжо.

Фашысцкія і ваенныя партыі ў капіталістычных краінах імкнуцца ўсе супярэчнасці вырашыць шляхам нападу на бацькаўшчыну ўсіх працоўных—СССР.

Памятаючы, што пагроза выбуху новай імперыялістычнай вайны з кожным днём набліжаецца, мы, равеснікі Окцябра і ўсё студэнцтва ўніверсітэта павінны ў некалькі разоў павысіць вывучэнне вайсковай справы, падрыхтаваць здаровых, выносліных адданых барацьбітоў абароны першай у свеце соцыялістычнай радзімы—СССР.

Соцспаборніцтва на вышэйшую ступень

Прафком універсітэта, працягваючы 3-ці тур соцыялістычнага спаборніцтва ВНУ і тэхнікумаў, намеціў: ахапіць усіх студэнтаў індывідуальным соцспаборніцтвам. Соцспаборніцтва праводзіць вакол прапрацоўкі максімума вучэбнага матэрыяла, за высокую якасць вучобы, за аўладанне тэхнікай самастойнай работы над кнігай, за сістэматычнае павышэнне свайго палітычнага і агульна-культурнага ўзроўня.

Аўладаць замежнымі мовамі, уцягнуць студэнтаў у навукова-даследчую работу, дабіцца высокаякаснага выканання дыпломных работ, падрыхтаваць некалькі навуковых дакладаў, дапамога адстаючым—вось тыя паказчыкі, вакол якіх павінна разгортвацца соцспаборніцтва.

Соцспаборніцтва факультэтаў павінна быць накіравана на тыя практычныя мерапрыемствы, якія праводзіць факультэт у мэтах заваявання пачэснага месца сярод іншых факультэтаў БДУ.

Стымуліраванне і заахвочванне ўдарнікаў і выдатнікаў у іх напружанай барацьбе за якасць вучобы павінна быць адным з галоўных мерапрыемстваў усіх грамадскіх арганізацый універсітэта.

Разгортванне новай хвалі соцспаборніцтва павінна праходзіць пад лозунгам большэвіцкай сустрэчы XVIII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі, пад лозунгам ад спаборніцтва адзіночак—да спаборніцтва мас!

Павысіць якасць партыйнай вучобы

„Бестурботнасць да ідэйнага выхавання, да тэорыі заўсёды была варожа большэвізму. Гэтая бестурботнасць вельмі характэрна для неустойлівых комуністаў. Не яны ўладаюць падзеямі ў сваёй свядомай дзейнасці, а падзеі ўладаюць імі, падаўляюць іх. У іх няма яснай перспектывы. Яны лёгка сходзяць з правільнага шляху. І толькі тэорыя, тэорыя марксізма-ленінізма, дае практычным работнікам „сілу арыентыроўкі, яснасць перспектывы, упэўненасць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы“.

(СТАЛІН).

(З перад. „Правды“).

На партзанятках

— Хто прапрацаваў даклад тав. Піка? А хто прапрацаваў увесь матэрыял па першай тэме?—запытала тав. Энгліна.

У адказ на пытанне, павольна, нібы баючыся, адзін за другім слухачы гурта гісторыі партыі павышанага тыпу падымалі рукі. Выявілася, што ніводзін комуніст не прапрацаваў поўнасцю матэрыяла па тэме.

— Першае пытанне, на якое мы павінны даць адказ—гэта, што гаварыла соцыял-дэмакратыя аб перспектывах сусветнага развіцця—працягвала тав. Энгліна.

Усе маўчалі... Не рашаліся выступаць... Чакалі вызава... Нарэшце пачуўся голас тав. Зеліковіча:

— Яны лічылі... Яны лічылі... Што ў капіталістычных краінах ідзе працвітанне... Яны лічылі... У нас ёсць стабілізацыя,—запінаючыся блытаў Зеліковіч.

Да гэтага блытанага і непраўільнага адказу каментары непатрэбны, ясна, што Зеліковіч матэрыяла на ведаў. Ці-ж адзін такі Зеліковіч? Не, зусім не.

Накшталт Зеліковіча была пераважная большасць комуністаў, а таму менш ўсяго адказвалі слухачы, амаль за ўсіх адказвала тав. Энгліна.

Другі не менш заслугоўваючы ўвагі парторгаў факультэтаў і парткома факт, што на партзанятках не з'явілася 14 комуністаў, як Бражанскі, Жаўнероў, Зельдзін, Рогаў, Скібарка, Юшпэ і іншыя.

Першыя партзаняткі паказалі, што значная частка комуністаў недаацаніла важнасці глыбокай прапрацоўкі матэрыялаў VII канграса Комінтэрна. У далейшым такое з'явішча не павінна мець месца ў нашай партарганізацыі. Парторгі факультэтаў павінны правяраць кожнага комуніста, як ён рыхтуецца да партзанятак і аказваць адначасова яму дапамогу.

Эмес

Палітзаняткі праходзяць ажыўлена

Прапрацоўка даклада тав. Піка на III курсе фізмата праходзіць ажыўлена. Студэнты актыўна выступаюць, дапаўняюць адзін другога, паглыбляюць адказ.

— Што азначае лозунг: „Клас супроць класа“?—задае пытанне прапагандыст тав. Струпінская.

Адразу падымаецца некалькі рук. Кожны жадае выступіць, выказаць свае думкі. Тав: Струпінская умела ўцягвае ў абгаварэнне пытанняў „маўчальнікаў“, хоць праўда іх мала ёсць на курсе.

Дрэнна толькі тое, што на III курсе фізмата яшчэ не дабіліся 100-процантнага наведвання палітзаняткаў. Так, на першых палітзанятках адсутнічала 5 студэнтаў і з спазніліся. Грамадскасць курса і факультэта на гэта зусім не рэагуе.

Паўлюц

КІРАЎНІК ЗРЫВАЕ ПАЛІТЗАНЯТКІ

3-га кастрычніка па ўсяму ўніверсітэту праводзілася палітвучоба. Студэнты першага курса геафака таксама своечасова прышлі ў палітшколу распрацоўваць матэрыял VII канграса Комінтэрна. Але невядома па якіх прычынах кіраўнік палітшколы тав. Астапенка не з'явіўся. Студэнты дарэмна чакалі, згубілі каля гадзіны каштоўнага часу

Партком БДУ павінен высвятліць, чаму тав. Астапенка сарваў першыя палітзаняткі. **Каласоўскі**

Шаблон і агульшчына

Прапрацоўка матэрыялу VII канграса Комінтэрна на першым курсе геафака праходзіць даволі непадрыхтавана. Комсамольцы даклад тав. Піка поўнасцю не прапрацавалі. Гэта яскрава было бачна ў час адказаў на першых палітзанятках. Адказы ў большасці слухачоў былі агульныя і шаблонныя. Такія студэнты, як Велічкевіч, Жук нават не ведалі аб чым рабіў справаздачу на VII кангрэсе Комінтэрна тав. Пік.

Заняткі прайшлі пасіўна і неарганізавана. Многа студэнтаў спазнілася, як напрыклад, Бейненсон, Нахімоўскі і рад другіх.

П. Нідрыч

Палітвучобу на належную вышыню

Палітвучоба павінна быць на ўзроўні непасрэднай задачы, звязанай з барацьбой за якасць акадэмічнай вучобы. Узоры большэвіцкай барацьбы за якасць марксісцка-ленінскага выхавання павінен паказаць гістарычны факультэт.

Аднак гэтага яшчэ не адчуваецца і асабліва на першым курсе ў беспартыйнай школе. Факты яскрава гавораць за сябе. На першыя палітзаняткі прышло многа студэнтаў, якія зусім не чыталі матэрыялаў VII канграса Комінтэрна.

Многа студэнтаў на пытанні кіраўніка тав. Кучара адказвалі з рук вон дрэнна.

Р. Б.

БУДЗЕМ СТАХАНАЎЦАМІ ВУЧОБЫ!

Рух адзіночак выдатнікаў—ператварыць у масавы рух студэнцтва

Узнімем новую хвалю соцыялістычнага спаборніцтва

Совецкі Саюз, дзякуючы творчай і пераможнай сіле соцыялістычнага спаборніцтва, у самы кароткі час дасягнуў нябачанай ў свеце магутнасці.

Соцыялістычнае спаборніцтва ахапіла мільёны працоўных нашай радзімы--адзіным парывам пабудаваць як мага хутчэй соцыялізм на адной шостай частцы свету і вывесці вялікі Совецкі Саюз у рады самых перадавых краін.

Соцыялістычнае спаборніцтва а'явілася магутным рычагом, дзякуючы якому рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі і мудрага кіраўніка тав. Сталіна перабудаваў адсталую ў мінулым краіну ў соцыялістычны форпост сусветнай рэволюцыі. Працоўныя нашай радзімы атрымалі магчымасць счасліва жыць і будаваць заможнае і культурнае жыццё.

Першая пяцігодка была напоўнена пафасам будаўніцтва. Другая пяцігодка —пафасам асваення новай тэхнікі. Новая хваля соцыялістычнага спаборніцтва пракацілася па неаб'ятным абшырам краіны соцыялізма, ахапіўшы рудзнікі і шахты, фабрыкі і заводы, саўгасы і калгасы, навучальныя ўстановы, паказаўшы нашы вялікія магчымасці, даючы многа рэкордаў і выхоўваючы шматлікія кадры герояў-рэкардсменаў, знатных людзей нашай радзімы—зотаў цаў, стаханаўцаў усіх галін нашай гаспадаркі, вопыт якіх становіцца вопытам мас і вядзе да новых перамог.

Разам з агульным ростам нашай краіны расце і мацнее Беларускі Дзяржаўны Універсітэт—дзеціпча Окцябра і ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Навучальны 1934-35 год з'явіўся пераможным годам у жыцці БДУ. Гэтаму году адпавядаў і трэці тур соцыялістычнага спаборніцтва, у якім БДУ паказаў добрыя паказчыкі.

Асноўным нашым дасягненнем у гэтым годзе з'яўляецца'тое, што мы сталі лепш вучыцца і лепш работаць. Таксама палепшыліся соцыяльна-быт[illegible] ўмовы студэнцтва. Але мы [illegible] вучыцца яшчэ лепш, бо ў гэтай г[illegible] мы не выкарысталі ўсіх магчымас[illegible]. Мы павінны рашуча ўзняць на на[illegible]ную вышыню [illegible] навуковых працаўнік[illegible] студэнтаў. Палепшыць нашу выхаваўчую работу, узняць на вышэйшую с[illegible]пень палітычную адукацыю і зна[illegible] палепшыць культурнае абслугоўван[illegible] студэнтаў.

Пачатак 1935-36 навучальнага года паказаў, што ўніверсітэт не дрэнна падрыхтаваўся да работы, але ў тойжа час, мы маем яшчэ рад недахопаў.

Арганізавана ўзняць на новую вышэйшую ступень соцыялістычнае спаборніцтва—агульная задача ўсіх грамадскіх арганізацый універсітэта. Сустракаючы XVIII гадавіну Окцябрскай рэволюцыі, ліквідуем адстаючыя ўчасткі нашай работы, вывядзем наш універсітэт у рады лепшых універсітэтаў Совецкага Саюза.

Праз разгортванне новай хвалі соцспаборніцтва—даб'емся новых перамог і па-большэвіцку сустрэнем вялікае свята працоўных усяго свету—XVIII гадавіну Окцябра.

Л. Камінскі

40 процантаў студэнтаў ахоплена аздаравіцельнай кампаніяй

Аздаравіцельная кампанія з'яўляецца неабходнай ўмовай для добраякаснай вучобы студэнтаў. У 1934-1935 вучэбным годзе рэктарыят і профарганізацыя БДУ ахапілі аздаравіцельнай кампаніяй 285 студэнтаў, што складае каля 40 проц. да ўсяго складу студэнтаў.

У дамы адпачынку было накіравана 140 чалавек, на курорты і санаторыі—28 чалавек, на экскурсіі—114 чалавек. Акрамя гэтага, многа студэнтаў атрымалі дадаткова ад рэктарыята і прафкома больш 10 тысяч рублёў грашыма для падтрымання свайго здароўя.

Усяго на правядзенне аздаравіцельнай кампаніі па універсітэту нашай дзяржавай выдаткавана 65 тысяч рублёў (не ўлічваючы навуковых і тэхнічных працаўнікоў). З гэтага відаць, што партыя і Совецкая улада праяўляюць штодзённа вялікія клопаты аб здароўі працоўных нашай краіны.

Наша задача яшчэ лепш вучыцца, каб не астацца ў доўгу перад дзяржавай.

Прадукцыйна работаю і культурна адпачываю

Атрымаць максімум ведаў—мая асноўная мэта. Мае асноўныя абавязкі—вучыцца на „добра" і „вельмі добра". Такі пункт я стаўлю ў соцумову ўжо 3-ці год. Сур'ёзнымі адносінамі да занятак, сістэматычнай прапрацоўкай матэрыялу, я на працягу ўсяго часу дабіваюся выканання гэтага пункта.

Добрасумленна выконваць грамадскую работу — другі пункт маёй соцумовы. З канца мінулага года я работаю прапагандыстам. Гэта работа мяне вельмі здавальняе.

Для агульнага развіцця і культурнага адпачынку я ўключыла пункт у соцумову: не менш двух разоў у месяц наведваць кіно і тэатр. У апошнія месяцы [illegible]ускаю ніводнай добрай [illegible]ываю

[illegible]ць такія жыццёвыя [illegible]жа кожны студэнт. Не[illegible]лькі сур'ёзна адно[illegible]ца да сваіх абавязкаў, умела і рацыянальна выкарыстоўваць свой час, каб прадукцыйна работаць і культурна адпачываць.

Фізмат. III курс
Струпінская.

Соцумова ў дзеянні

Канкрэтная соцумова, з указаннем тэрміна выканання ўзятых абавязкаў, падымае акадэмпаспяховасць, палітычны і культурны ўзровень студэнтаў. Яркім прыкладам гэтага можа служыць студэнт IV курса хімфака тав Элентух.

Элентух паступіў ва ўніверсітэт з слабай падрыхтоўкай. На першым курсе быў сяраднім студэнтам. Упартая работа над сабой праз год рэзка змяняе яго паказчыкі. На другім курсе тав. Элентух ўжо атрымлівае ў асноўным адзнакі на „добра".

На III курсе тав. Элентух вучыцца на „добра" і „вельмі добра". Сёлета тав. Элентух абавязаўся таксама здаць усе прадметы не ніжэй чым на „добра", да першага снежня падабраць адпаведную літаратуру для дыпломнай работы, матэрыялы VII кангрэса Камінтэрна прапрацаваць на „вельмі добра". Узорна работаць у лабараторыі на практычных занятках і т. д.

Тав. Элентух па-большэвіцку змагаецца за выкананне сваей соцумовы. Ён на працягу трох гадоў вучобы ў БДУ актыўна ўдзельнічае ў грамадскай рабоце.

Махціна і Генава.

Трэба арганізаваць і кіраваць

Профарганізацыя гістарычнага факультэта, у прыватнасці профоргі, за паўтарамесячны вопыт работы павінны былі зрабіць для сябе вельмі важныя вывады.

Узяць адну з самых важнейшых работ—гэта разгортванне соцспаборніцтва. Верасень месяц профоргі раскачваліся. Профарганізатар факультэта тав. Грашчэнка абмежаваўся дачай указанняў проф оргам груп т. т. Ясінаву, Церэшчанку і інш. па заключэнню соцумоў. Як-жа ідзе заключэнне соцумоў—тав. Грашчэнка не цікавіўся і не правяраў работы профоргаў груп. Групавыя профарганізатары да гэтай важнай работы аднесліся фармальна. Выпрацавалі соцумовы для груп, на трохмінутных сходах галаснулі на хуткую руку і на гэтым супакоіліся. Індувідуальнага соцспаборніцтва паміж студэнтамі не разгортвалі. На першым курсе акрамя профоргаў гэтай жа работай яшчэ займаліся спецыяльна выбраныя тройкі.

Зусім іншае становішча мы маем ў гэтым месяцы.

На сёнешні дзень увесь гістарычны факультэт ахоплен соцспаборніцтвам. Заключаны ўмовы не толькі паміж групамі, але індывідуальна. Умовы канкрэтныя.

Так, напрыкл.: т. Мельнік на працягу кастрычніка месяца абавязаўся напісаць даклад па гісторыі Беларусі на „вельмі добра". Прачытаць не менш трох кніг мастацкай літаратуры. Тав. Кецко абавязаўся атрымаць адзнакі „добра" па ўсіх прадметах. Профоргі груп завялі сшыткі, дзе амаль штодзенна адзначаюць выкананне соцумоў і абавязацельстваў кожным студэнтам.

Чаму такі рэзкі кантраст паміж работай у верасні і цяпер? Таму, што профоргі працавалі адзіночкамі, не згуртоўвалі вакол сябе профсаюзнага актыва, не выкарыстоўвалі насценнага друку, ды самі не ведалі як трэба арганізоўваць соцспаборніцтва.

І толькі калі гэтым пытаннем сур'ёзна занялася партарганізацыя і факультэцкая газета, профоргі пры правільнай расстаноўцы сіл у два дні дабіліся лепшых вынікаў, чым за ўвесь верасень.

Трэба адзначыць, што прафком БДУ таксама недастаткова кіруе соцспаборніцтвам.

Малюкевіч.



Студэнты геалагічнага і гістарычнага факультэтаў заўсёды калі пераходзяць з аднэй аўдыторыі ў другую павінны насіць з сабой крэслы

Больш увагі дыпломнікам

Стварэнне спрыяючых умоў для работы дыпломнікаў—асноўны залог для паспяховага завяршэння вучобы БДУ. Аднак дыпломнікам біяфака яшчэ і цяпер не створаны адпаведныя ўмовы для нармальнай работы. З пачатку навучальнага года дыпломнікаў ганялі з інтэрната ў інтэрнат, з пакоя ў пакой.

Не зусім добра абстаіць справа з тэмамі дыпломных работ. Тэмы былі вызначаны яшчэ ў мінулым годзе і ніхто сёлета не натурбаваўся даць грунтоўныя растлумачэнні па іх. (Адсюль многія студэнты акрамя назвы тэмы нічога не ведаюць).

Дрэнна і тое, што канчаючы БДУ, біяфакаўцы будуць не зусім поўнацэннымі спецыялістамі. Так, напрыклад, на чацвертым курсе батанікаў рэдка хто са студэнтаў можа добра распазнаваць расліны, а гаварыць аб сістэматцы раслін, морфалогіі раслін зусім не варта, бо тут адзінкі ведаюць прадмет. Вывучаючы раслінны і жывёльны свет, мы штодзенна сустракаемся з аб'ектамі, якіх ніколі не бачылі. Ш.

ВЫШЭЙ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ!

Класавы вораг выкрыт

Гістарычная пастанова СНК і ЦК ВКП(б)„Аб арганізацыі вучэбнай работы і ўнутраным распарадку ў пачатковай, няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школе“ яшчэ раз гаворыць, з якой большэвіцкай паслядоўнасцю партыя і асабіста тав. **Сталін** з дня ў дзень клапоціцца аб школе, аб выхаванні падрастаючага маладога пакалення.

Гэтая пастанова з'яўляецца новым этапам у жыцці школы, яна кладзе канец таму абураючаму беспарадку, які да гэтага часу меў месца ў нашай школе.

Гэтую гістарычную пастанову з вялікім энтузіязмам сустрэла настаўніцтва, вучнёўства і ўся совецкая грамадскасць нашай радзімы. Класаваму ворагу гэта непанутру. Класавы вораг сустрэў гэтую пастанову з шалёнай злобай і нянавісцю, бо яна наносіць яму сакрушальны ўдар.

Вось чаму класавы вораг цяпер шукае новыя метады барацьбы з совецкай сапраўднасцю. Ён пераходзіць да метадаў дыскрэтацыі і рэвізіі пастаноў партыі і ўрада. Класавы вораг імкнецца атруціць галовы маладому пакаленню, што мела месца на рабфаку БДУ.

Выкладчык мовы і літаратуры рабфака БДУ **Самковіч**, выконваючы ролю класавага ворога, паставіў пад сумненне правільнасць пастановы партыі і ўрада аб школе.

Самковіч пачаў нанасіць паклёпы на асобныя раздзелы пастановы партыі і ўрада ад 3-га верасня. Ён гаварыў, што адзнака паспяховасці „посредственно“ шкодна, будзе кампраметаваць студэнта і наогул няудачная. У сваім выкладанні на рабфаку Самковіч імкнуўся даказаць, што пролетарскі паэт Андрэй Александровіч у сваім творы „Цені на сонцы“ здзекаваўся над нацдэмамі. Да студэнтаў ён адносіўся груба, даваў ім розныя мянушкі, даказваў, што ў нашай школе няма парадку, у параўнанні з царскай школай.

На сходах Самковіч заўсёды імкнуўся дыскрэтаваць Совецкую уладу, выказваў неаднаразова варожыя погляды на соцбудаўніцтва. Адсюль зусім яскрава бачан твар Самковіча, як класавага ворага і заядлага нацдэма, які сістэматычна праводзіў сваю шкодную работу ў нашай совецкай школе.

Гарача падрымліваў класавага ворага, нацдэма Самковіча і настаўнік-матэматык рабфака БДУ Каган. Ен тасама падвяргаў сумненню пастанову партыі і урада аб школе. Каган імкнуўся даказаць настаўніку **Цывіну** і іншым, што гэтая пастанова неабдуманая.

Класава-варожыя выступленні Самковіча і Кагана яшчэ раз гавораць, што класавыя ворагі жывуць і праводзяць „ціхай сапай“ сваю шкодную работу. Трэба адзначыць, што некаторыя настаўнікі патуралі класаваму ворагу і нават на сходзе выказваліся і галасавалі за тое, каб Самковіча пакінуць на рабоце (Астроўскі).

Упаўне правільна рашыла дырэкцыя рабфака, калі яна з трэскам выгнала нацдэма, класавага ворага Самковіча з радоў настаўніцтва, і вынесла суровую вымову з апошнім папярэджаннем настаўніку Кагану.

Гэтыя факты яшчэ раз гавораць аб неабходнасці павышэння класавай пільнасці, рашучай барацьбы з класавым ворагам, узняцця выхаваўчай работы і разгортвання большэвіцкай самакрытыкі.

Узняўшы класавую пільнасць, да канца выгнаўшы са сваіх радоў класавых ворагаў, настаўніцтва, студэнцтва рабфака з гонарам выканае задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам па выхаванню сапраўдных патрыётаў нашай вялікай радзімы.

К.



Будучы выгляд інтэрната БДУ па Нова-Маскоўскай

Будаўніцтва інтэрната зрываецца

Студэнты павінны жыць у культурных умовах. Найлепшым культурным умовам жыцця будзе адпавядаць інтэрнат, які будуецца на Нова-Маскоўскай. Праўда, будаўніцтва інтэрната знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Тэрмін, устаноўлены Соўнаркомам, даўно прайшоў, але ж будаўніцтва далёка не закончана. Па дагавору з будаўнічым трэстам інтэрнат павінен быць здан у эксплаатацыю першага лістапада, але таксама і ў гэты тэрмін будаўніцтва будзе не закончана.

— Не хапае будаўнічых матэрыялаў, кровельнага жалеза, цэменту, і т. д.—гаворыць прараб тав. Ждан. Да гэтага часу не ўстаноўлена паравое атапленне, што з'яўляецца асноўнай перашкодай для працягвання ўсіх будаўнічых работ. Па дагавару катлы для атаплення павінна прадставіць гаспадарчая частка рэктарыята. І вось ужо месяц цягнуцца перагаворы паміж будаўнічым трэстам і ўніверсітэтам, але катлы ўсё не прыбываюць.

Аб усім гэтым добра ведае будаўнічы сектар Наркомасветы, але з свайго боку належных мер не прымае.

Мы павінны мабілізаваць усю грамадскасць універсітэта, каб ва што-б там ні стала закончыць будаўніцтва інтэрната да 18 гадавіны Окцябрскай рэволюцыі.

Левановіч і Зінгер.

Брыгада Мурашкі—лепшая на будаўніцтве інтэрната

Брыгада плотнікаў на чале з брыгадзірам тав. Мурашка—адна з перадавых на будаўніцтве інтэрната па Нова-Маскоўскай. Плотнікі гэтай брыгады сваю норму заўсёды выконваюць на 150 процантаў. У ліку лепшых плотнікаў—сам брыгадзір вав. Мурашка, плотнік тав. Тарасевіч і інш.

Гэтых высокіх паказчыкаў брыгада дабілася шляхам соцспаборніцтва, рацыянальнай расстаноўкай людзей і добрай працдысцыпліны.

Студэнты павінны браць прыклад з перадавікоў будаўніцтва інтэрната і таксама выконваць свае акадэмічныя заданні на 150 процантаў.

П. Левановіч.

Астроўскі грае на руку класаваму ворагу

Можна заўважыць калі збіраецца група студэнтаў фізмата вакол Астроўскага А. Ён мастак расказваць розныя анекдоты. Цікава паслухаць пасля матэматычных формул—так разважаюць часта студэнты.

Аб чым гаворыць Астроўскі? Глыбока, правільна палітычна ацаніць кожны выказаны анекдот Астроўскім, даць належны адпор такой сістэме, амаль ніхто на факультэце не задаваўся мэтай. Хоць усім добра вядома, што ў мінулым годзе Астроўскі пры выяўленні контррэволюцыянераў і трацкістаў Алешына і Харанека П. не галасаваў за іх выключэнне.

Палітыка-выхаваўчая работа ва ўніверсітэце на працягу трох год і нарэшце ўсе тыя суровыя спагнанні і папярэджанні, якія атрымаў Астроўскі не паклалі адбітку ў сэнсе перамены яго поглядаў і паводзін.

Астроўскі працягвае і зараз расказваць розныя вульгарныя анекдоты, за якімі хаваецца контррэволюцыйны змест.

Так, 4-га верасня ім была праяўлена класава-варожая вылазка ў інтэрнаце па Нова-Мясніцкай.

Група фізікаў III-га курса, разглядзела гэтае пытанне, дала ацэнку вылазцы Астроўскага, але няправільна зрабіла вывад, выпесшы яму суровую вымову з папярэджанем за праяўленне класава-варожай вылазцы.

Дапушчаную ў групе памылку неабходна выправіць—разглядзець справу аб мэтазгоднасці прабывання яго ў ліку студэнтаў універсітэта.

Я. Сінцоў

Фізкультура ў загоне

Ці варта гаварыць, якое вялікае значэнне мае фізкультура ў нашых умовах? Нашай радзіме патрэбны культурныя людзі, здаровыя целам, бадзёрыя духам. Аднак, у БДУ ўмовы для фізкультурнай работы далёка не спрыяючыя.

Па-просту гаворачы тут фізкультура зусім у загоне: няма сапраўднага фізкультурнага зала, амаль адсутнічае спартыўны інвентар і няма грошай на аплату кіраўнікоў секцый. Усё гэта не дае магчымасці правесці трэніроўку і масавую здачу норм на ГПА.

БДУ павінен узяць прыклад добрага фізвыхавання студэнтаў у політэхнічным інстытуце. Там студэнты забяспечаны усімі ўмовамі для фізкультурнай работы. Гэтым летам фізкультурнікі політэхнічнага інстытута зрабілі шлюпачны пераход Менск-Кіеў. Зімой яны мяркуюць зрабіць лыжны пераход Менск-Кіеў.

Трэба як мага хутчэй перанесці добры вопыт фізкультурнай работы ў БДУ.

Хама.

...І часта хлопцы размінаюць мускулы ў падушачным баі

ПА СЛЯДАХ НЕ ДРУКАВАНЫХ ПІСЕМ

„Студкор“ у сваім пісьме рэдкалегіі пісаў аб тым, што выкладчык фізікі тав. Маслакавец на першым курсе біяфака прыпадносіў чытаемы прадмет незразумела і большасць студэнтаў біяфака фізікі не засвоіла.

У адказ на наша запатрабаванне даць тлумачэнне загадчык навучальнай часткі БДУ тав. Лемеш паведамляе, што выкладчык фізікі тав. Маслакавец ад чытання лекцый на першым курсе біяфака аслабанён. Чытанне лекцый фізікі перадана дацэнту тав. Пелепу.

Пісьмо ў рэдакцыю

Трэба хуткая дапамога

Амаль самай беднай і горшай у сэнсе абсталявання—гэта кафедра марфалогіі і сістэматыкі раслін. Дастаткова сказаць, што кафедра не мае ніводнай здавальняючай прапаравальнай лупы, толькі адзін мікраскоп, няма ніводнай табліцы і наогул ніякіх наглядных дапаможнікаў.

Па курсу генетыкі, палеобатанікі і геобатанікі няма ніводнай спецыяльнай шафы для хавання гербарыя.

У кафедры няма патрэбнай колькасці шкляной пасуды для фіксацыі матэрыялаў. Няма брытв, ланцэтаў і пінцэтаў для практычных заняткаў студэнтаў, няма таксама колькі нібудзь утульнага памяшкання для кафедры. Кафедра прытулілася ў маленькім пакойчыку, у якім не толькі не магчыма працаваць, але няма дзе павярнуцца.

Усё гэта адбіваецца на якасці вучэбнай работы. Студэнты па раду прадметаў не атрымліваюць неабходнай тэхналагічнай практыкі, якая абавязкова патрэбна ім для навукова-даследчай работы ў далейшым.

Ёсць добры гербары, але ён не разабран і разабраць яго немагчыма, бо няма неабходнага памяшкання.

Таксама нельга ўцягваць у навукова-даследчую работу студэнтаў старэйшых курсаў. Такое ненармальнае становішча можа захоўвацца да даго часу пакуль кафедра не атрымае адпаведнага памяшкання і сродак на абсталяванне.

У сувязі з адсутнасцю ва ўніверсітэце сродкаў, я звярнуўся асабіста да наркома асветы тав. Чэрнушэвіча з просьбай адпусціць некалькі тысяч рублёў на закупку луп і прыгатаўленне табліц. Па распараджэнню тав. Чэрнушэвіча НКА асігнаваў кафедры 5000 руб. Гэта было ў жніўні месяцы 1935 г. Але вось ужо амаль палова кастрычніка, а гэтых грошай у кафедры няма.

Патрэбна прыняць адпаведныя меры для таго, каб дапамагчы матэрыяльна кафедры, абсталяваць яе і гэтым самым даць магчымасць палепшыць пастаноўку вучэбнай справы і даць магчымасць разгарнуць навукова-даследчую работу сярод студэнцтва ўніверсітэта.

Загадчык кафедры
Бордакоў.

ІНТЭРНАТЫ НЕ ГАТОВЫ ДА ЗІМЫ

Падрыхтоўка інтэрнатаў да зімы—галоўная задача гаспадарчай часткі БДУ. Між іншым, інтэрнаты на Студэнцкай 27 і 52 да зімы зусім не падрыхтаваны. У інтэрнатах страха накрыта надзвычай дрэнна, амаль усе пакоі цякуць. У некаторых пакоях патрэбна уставіць шыбы ў вокны і ацяпліць дзверы. У інтэрнаце 27 амаль усе падвойныя вокны не маюць шыб. Дзверы ў карыдоры разломаны, праз іх лазяць сабакі. У абодвух інтэрнатах няма спецыяльнага пакою для ўмывальні. Студэнты мыюцца пад адкрытым небам.

На ўсё гэта камендант тав. Сапега не зварачвае ніякай ўвагі. Ніякіх мер таксама не прымае і гаспадарчая частка БДУ (Шастакоўскі), каб своечасова падрыхтаваць інтэрнаты да зімы.

Мармалёў.

Аб „дробязях“

Бягучы навучальны год БДУ сустрэў значна лепш падрыхтавана, чым летась. Але разам з гэтым маецца шмат недахопаў. У інтэрнаце па Нова-Мясніцкай Ва ўмывальні няма водаадводнай трубы, у выніку кожны дзень сапраўдны „патоп“. Брудная вада зліваецца ў вёдры і не выносіцца днямі. Пакоі інтэрната не забяспечаны шчоткамі і настольнымі кляёнкамі.

У інтэрнаце галоўнага корпуса на працягу 2-х месяцаў не рабілася дэзінфекцыя. Культурна-масавая работа ва ўсіх інтэрнатах не разгорнута. Гэты ўчастак работы прадастаўлен поўнай стыхіі. Арганізатары, якія павінны заняцца гэтай справай, супакоіліся на тым, што чырвоныя куткі зачынены.

Здор і Ш.

ТУРБОТЫ КАМЕНДАНТА

Пачалося з таго, што чалавек з'явіўся ў барак № 27 і назваўся новым камендантам. Першы раз абгледзіў пакой і швёрда парашыў: Тут-бы, добра і пажыць было...

І пайшоў чалавек стукаць, а вось і дадуць, а вось уступяць. Заходзіць ў пакой 13 і просіць ласкава.

— Ведаеце, таварышы, убірайцеся з пакоя. Тут павінны жыць сямейныя.

— Куды ўбірайцеся... запыталіся жыхары.

— У 17 пакой.

У студэнтаў геафака 13-га пакоя паўстала ўяўленне аб 17 пакоі: столь падперта слупам, разламаная печка дыміць, на сценах поўна вільгаці.

— Не, мы не пойдзем туды...

— Зараз-жа пераходзьце ў 52 барак.

— Чаму? Нам і тут добра. Але вось, каб партрэтаў нам, ды кляёнку...

— Нічога не дам... Жывіце як ведаеце. Вас „просяць“, каб перайшлі... Зімой дроў не дам.

Не здзейснілася мара. Тады ён пайшоў на хітракі. Помста за помсту. У пакой № 17 патрэбна даць шмат „дробязей“, якія-б дапоўнілі абсталяванне, а іменна: фіранак, графінаў і т. д. і нічога не дае Бывае і так, што ў пакой № 17 пасля дажджу магчыма зрабіць душ новай сістэмы.

— Заходзце, калі ласка, камендант тав. Сапега. Не цурайцеся... Вы можаце карыстацца дармова... Мы дазваляем... Душ функцыяніруе без рэгулятараў. В.

Нам пішуць

АДЧЫНІЦЬ ГАБІНЕТ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

Справа з вывучэннем замежных моў абстаіць не зусім добра на ўсіх факультэтах БДУ. З прыкладу 1-га курса гістфака відаць, што ёсць адстаючыя па нямецкай мове.

Праектуецца адчыніць габінет замежных моў, але гэта толькі на паперы. Навучальная частка БДУ, а таксама кафедра замежных моў павінны ў самым хуткім часе паклапаціцца, каб быў адчынен габінет замежных моў.

Місун.

Музінструменты і радыё-кропкі— у інтэрнаты!

Многа гаварылі ў мінулым годзе, што ў інтэрнатах БДУ няма музычных інструментаў, няма радыё-кропак. Сёлета не змянілася: ні музычных інструментаў, ні радыё-кропак у інтэрнатах няма. Ці не пара гаспадарчай часткі паклапаціцца, каб задаволіць гэтыя запатрабаванні студэнтаў.

Студэнт.

АРГАНІЗАВАЦЬ ГАЗЕТНЫ КІОСК

Некалькі разоў адміністрацыя і прафком універсітэта займаліся пытаннем арганізацыі газетнага кіоска ў БДУ, але апошняга і сёння няма. Студэнты пазбаўлены магчымасці своечасова набыць газету, патрэбны журнал, або навінку з мастацкай літаратуры.

М.

Універсітэцкая хроніка

У хуткім часе будзе праведзен дыспут па твору Чорнага „Трэцяе пакаленне“.

* * *

Літгурток універсітэта правёў трое занятак. Прапрацаваны тэмы: што такое мастацкая літаратура і яе значэнне ў соцыялістычным будаўніцтве. Зараз распрацоўваецца тэхніка верша. Лік гурткоўцаў расце. На першых занятках было 13, а цяпер у гуртку займаюцца 22 студэнты. Літгурток кіруе тав. Алехновіч.

* * *

Абвешчан конкурс на лепшую насценгазету факультэта і групы. Для пераможцаў конкурса вылучан рад прэмій. Конкурс працягваецца да 1-га студзеня 1936 г.

* * *

Пачалі работу наступныя гурткі: Хор гурток (кіраўнік тав. Тэраўскі), Гурток заход-еўрапейскіх танцаў (кіраўнік т. Губанаў). Фотогурток (кіраўнік т. Габрыелаў).

* * *

Загадам рэктара БДУ з 1-га кастрычніка забаронена выдача стыпендыі за мінулы час. Рэктар папярэдзіў усіх стыпендыятаў як універсітэта, так і рабфака, што стыпендыя выдаецца толькі з 20 га па 31-е чысло за даны месяц. Ніякія спасылкі на аб'ектыўныя ўмовы прымацца не будуць. У выпадку адсутнасці па ўважлівых прычынах—трэба ставіць даручэнне таварышу.

Арганізаваць навукова-даследчую работу

„Людзей трэба клапатліва і ўважліва вырашчваць, як садоўнік вырашчвае аблюбаванае плодовае дрэва“.
(І. СТАЛІН)

Пастановай СНК БССР ад 26 ліпеня па дакладу рэктара БДУ прадугледжваецца разгортванне навукова-даследчай работы кафедр і адначасова з тым уцягненне ў навукова-даследчую работу студэнтаў апошніх курсаў.

Кафедры БДУ склалі календарны план выканання тэм у бягучым і часткова ў наступным навучальным годзе.

Усяго вызначана 59 тэм: з іх узята прафесарамі—22, дацэнтамі—21, астатнія тэмы асістэнтамі. Па факультэтах тэмы размяркоўваюцца так: хімічны—15, біялагічны—14, фізіка-матэматычны—19. і геолага-глебава-геаграфічны—11. Не прадставіў тэматыкі гістарычны факультэт.

Прадстаўленая кафедрамі тэматыка ахапляе: вынікі работы навукова-даследчых лабараторый БДУ па лабараторыі хіміі торфа, работа проф. Змачынскага „хлорыраванне і амідзіраванне торфа ў прысутнасці фасфарытаў“, па лабараторыі фізіялогіі раслін—праф. Годнева „вывучэнне накаплення хлорафіла ў растучых лісцях у сувязі з ростам пласцыд“; па фізічнай лабараторыі—прафесара Сняткова „Цеплавы эфект ды электрыкаў у полі высокай частаты“.

Актуальнейшыя праблемы тэорыі розных навук:

„праблема ядра атама“—работа праф. Успенскага.

„тэорыя біцыркулярных крывых“—праф. Дыдырко і інш.

Праблемы, якія звязан ы з вывучэннем прыродных багацця ў Беларусі і „карысныя выкапні Беларусі“—работа праф. Чурына; „лёес і лёесавідныя пароды БССР“—дацэнта Цэпенко;

Работы, якія з'явяцца вынікамі праектуемых экспедыцый па вывучэнню вазёр БССР;

Работы, якія прадстаўляюцца на атрыманне ступені доктара ці кандыдата навук—як тав. Нікіфарава „Статыстычнае даследванне фізіка-хімічных з'яў“ (доктарская дысертацыя), тав. Мельніка „Размеркаванне напражэння ў цыліндрах“ (доктарская дысертацыя); тав. Дудзінскага—„Кінетыка ўзрыўных рэакцый“ (кандыдацкая дысертацыя).

Частка вызначаных тэм выконваецца да 1-га студзеня 1936—работы праф. Чурына „Цэаліты“ і „Стронцыяніты“; доктарская дысертацыя тав. Нікіфарава; першая частка работы тав. Бордакова „Карэляцыйная залежнасць утрымання хімічных вяшчэстваў ў зярне і яе значэнне для селекцыі“; работа тав. Малішэўскай „Адсорбцыя ртутных салей раслінным жывёльнымі валокнамі“ і інш.

БДУ выпускае ў 1935 г. тры зборнікі навуковых работ, матэрыял для якіх абіраўся на працягу двух год. У 1936 г. намечана к выпуску шэсць зборнікаў, што будзе магчыма пры ўмове своечасовага выканання вызначанага кафедрамі плана.

Галоўнейшым-жа недахопам у галіне навукова-даследчай работы БДУ з'яўляецца невыкананне прапановы СНК БССР аб уцягненні студэнтаў у навукова- даследчую работу. Кафедры пакуль абмежаваліся тым, што адкрылі запіс студэнтаў, жадаючых прыняць удзел у навуковай рабоце, але і гэты запіс не даведзен да канца.

Трэба зараз-жа рашуча ўсім дэканатам і кафедрам узяцца за выкананне пастановы СНК.

Лемеш.
Шкляеў.

Адказны рэдактар М. Г. СТОЦКІ

Менгарліт № 2833 Тыраж 1500—зак. 1052
Друкарня ВКСГШБ